УДК:792.036(476)”19/20”:398-047.48(=161.3)

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ФАЛЬКЛОРУ НА БЕЛАРУСКАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ СЦЭНЕ

***Д. А. Мардань,*** *магістр мастацтвазнаўства, аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблеме інтэрпрэтацыі фальклору на тэатральнай сцэне Рэспублікі Беларусь. Мэтай даследавання з’яўляецца характартыстыка інтэрпрэтацыі фальклору на прыкладзе пастановак драматычных і музычных тэатраў. Раскрываецца практычная запатрабаванасць уключэння народнай культуры ў тэатральныя пастаноўкі. Разглядаюцца этапы ўкаранення беларускага фальклору ў тэатральную дзейнасць. Праведзены аналіз актуальных тэатральных тэндэнцый, які сведчыць аб актыўным выкарыстанні народных традыцый у пастаноўках драматычных, музычных тэатраў. Ставіцца праблема нацыянальнай ідэнтыфікацыі, стварэння спектакляў, прысвечаных знакавым постацям і гістарычным падзеям. Падкрэсліваецца важнасць захавання нацыянальнага каларыту ва ўмовах сінтэзу культур XXI ст.

**Ключавыя словы**: фальклор, інтэрпрэтацыя фальклору, аўтэнтыка, тэатр, спектакль, сінтэз.

# HISTORICAL PREREQUISITES FOR THE INTERPRETATION OF FOLKLORE ON THE BELARUSIAN THEATER STAGE

***D. Mordan,*** *Master of Art History, postgraduate student of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to an urgent problem of interpretation of folklore on the theatrical stage of the Republic of Belarus. The purpose of the study is the characteristics of folklore interpretation on the example of dramatic and musical theater productions. The practical relevance of the inclusion of folk culture in theatrical productions is revealed. The stages of the introduction of Belarusian folklore into theatrical activity are considered. The analysis of current theatrical trends is carried out, there is an active use of folk traditions in the productions of dramatic and musical theaters. The article raises the problem of national identification, the creation of performances dedicated to iconic figures and historical events. The article emphasizes the importance of preserving the national flavor in the context of the synthesis of cultures of the XXI century.

**Keywords:** folklore, interpretation of folklore, authentic, theater, performance, synthesis.

Канец XX – пачатак XXI ст. характарызуецца пачаткам беларусізацыі, нараджэннем новых творчых напрамкаў, адраджэннем фестывальнага руху. Нацыянальная асаблівасць найбольш ярка выяўляецца ў тэатральным мастацтве, якое належыць да ліку адной з важнейшых сфер гра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадскага жыцця нацыі. Пытанне інтэрпрэтацыі фальклору паўстала ў сувязі з адаптацыяй і мадыфікацыяй фальклору ў сучасных умовах, якія адрозніваюцца ад тых, у якіх фальклор бытаваў у архаічным выглядзе. Адсутнасць комплекснага даследавання, прысвечанага інтэрпретацыі фальклору на тэатральнай сцэне Рэспублікі Беларусь, вызначыла мэту артыкула.

Вытокамі беларускага сцэнічнага мастацтва з'яўляліся народныя вераванні, абрады і рытуалы, таму, верагодна, рэжысёры звяртаюцца да першакрыніц і ў сучаснай сцэнічнай практыцы з мэтай абуджэння нацыянальнай самасвядомасці ў гледачоў. Без гістарычнага кантэксту прааналізаваць этапы інтэрпрэтацыі фальклору немагчыма, таму звернемся да пачатку XX ст. У папулярызацыі беларускай тэатральнай дзейнасці на сцэнічных пляцоўках нашай краіны і за мяжой вялікая заслуга належыць трупе Ігната Буйніцкага (пазней – Беларускі народны тэатр), якая пачала сваю дзейнасць у 1907 г. У пастаноўках дэкламаваліся творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, выкарыстоўвалася больш за дзясятак беларускіх народных танцаў – «Лявоніха», «Юрка», «Мельнік», «Антошка», «Чобаты», «Качан», «Чабор», «Барыня», «Полька» і інш. З 1910 г. трупа Ігната Буйніцкага гастралявала па Беларусі, у Санкт-Пецярбургу, Варшаве, прапагандуючы беларускае сцэнічнае мастацтва і народную харэаграфію [8]. Дзейнасць трупы І. Буйніцкага актыўна падтрымлівалі газета «Наша Ніва», прагрэсіўныя дзеячы беларускай культуры Янка Купала, Цётка, Цішка Гартны, З. Бядуля. Аднак матэрыяльныя цяжкасці прымусілі І. Буйніцкага ў 1913 г. спыніць дзейнасць тэатра. Відавочна, што ў Беларускім народным тэатры народныя песні і танцы выконваліся ў першапачатковым выглядзе, без апрацоўкі, змянення тэмпарытму і сэнсавай нагрузкі. Нягледзячы на сцэнічную адаптацыю, выканаўцы захоўвалі дакладную мастацкую форму твораў.

Адметным этапам укаранення беларускага фальклору ў тэатральную дзейнасць з'яўляецца тэатр Уладзіслава Галубка. У 1917–1920 гг. рэжысёр «Першага таварыства беларускай драмы і камедыі» паставіў свае першыя п'есы: «Пісаравы імяніны» (1917), «Апошняя сустрэча» (1917), «Бязвінная кроў» (1918), «Бязродны» (1919). У 1920 г. стварыў і ўзначаліў уласны тэатр «Трупа Галубка». За пяць гадоў трупай было дадзена каля 1000 спектакляў для сялян і працоўных. Рэпертуар складаўся ў асноўным з п'ес аўтарства самога У. Галубка («На плытах», «Бязродныя», «Падкідыш», «Суд» і інш.). З 1926 па 1932 г. тэатр быў вядомы як Беларускі дзяржаўны перасоўны тэатр, у 1932–1937 г. – Трэці беларускі дзяржаўны тэатр з базай у г. Гомелі [8]. У пастаноўках выконваліся беларускія народныя танцы і песні, ужываліся элементы абрадаў – Купалле, Жніво, Каляды і г. д. У пач. XX ст. намячаецца станоўчая тэндэнцыя ў развіцці беларускага сцэнічнага мастацтва, вядучую ролю ў якім адыгралі К. Каганец, Янка Купала, Якуб Колас, К. Буйло, Ф. Аляхновіч, Л. Радзевіч і інш. Дзякуючы таму, што Беларускі трэці дзяржаўны тэатр (БДТ-III) ужываў у пастаноўках элементы абрадаў, умовы дэманстрацыі фальклору былі набліжаныя да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

натуральных народных традыцый. Гэта важны крытэрый, таму што абрад – сукупнасць дзеянняў сакральнага характару, якой уласціва сімвалічнае значэнне, і выкананне спеваў і танцаў выглядае натуральна менавіта ў кантэксце.

З цягам часу са зменай пакаленняў магчымасці ў выканаўцаў чуць манеру выканання народных песен розных рэгіёнаў і вучыцца народным танцам менавіта ад носьбітаў традыцый амаль не засталося, альбо яна стала вельмі рэдкай. Як вынік, папулярнай формай стаў стылізаваны, другасны, або секундарны, фальклор. Народныя песні і танцы выконваюцца ў апрацоўцы і адаптаваныя да сцэнічнай культуры для больш зразумелага ўспрымання гледачамі.

У канцы XX – пачатку XXI ст. важную справу ў сферы тэатральнай крытыкі зрабіў Цэнтр тэатральнай крытыкі «Авансцэна» (з 1992 па 1997 г., далей – Беларускі саюз літаратурна-мастацкіх крытыкаў) пад кіраўніцтвам Рычарда Смольскага – беларускага тэатразнаўца, педагога, доктара мастацтвазнаўства. Статыстыка нацыянальных спектакляў паказала, што часцей за ўсё рэжысёры беларускіх тэатраў звярталіся да сусветнай класікі, твораў рускай драматургіі, замежных п’ес. Творы нацыянальнай класічнай спадчыныназіраліся рэдка, хаця менавіта такія пастаноўкі – выдатная магчымасць папулярызацыі багатай, адметнай беларускай народнай культуры. У 1994–95 гг. пастаноўкі паводле твораў нацыянальнай класікі на сцэне акадэмічных тэатраў увогуле адсутнічалі [7, с. 8].




*Дыяграма пастановак паводле твораў нацыянальнай класікі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цяперашні час у Беларусі існуе 27 дзяржаўных тэатраў (1 – оперы і балета, 1 – акадэмічны музычны, 17 – драматычных і музычных, 7 – тэатраў лялек і 1 – Тэатр юнага гледача). У Мінску – 11 тэатраў, Брэсце – 2, Віцебску – 2, Гомелі – 3, Гродне – 2, Магілёве – 2, Маладзечне – 2, ёсць тэатры ў Бабруйску, Слоніме, Мазыры [7]. Акцёраў, рэжысёраў, сцэнографаў, тэатразнаўцаў рыхтуюць Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Галоўнай рысай сучаснай тэатральнай практыкі з'яўляецца спроба сінтэзу новых методык сцэнічных здольнасцей і захаванне нацыянальнага каларыту. Трэба валодаць асаблівым мастацкім густам, каб класічныя творы беларускіх аўтараў гучалі па-новаму і не страцілі сваёй першапачатковай мэты. Гэта тычыцца сцэнаграфіі, музычнага афармлення, касцюмаў і ўвогуле ведаў рэжысёра і акцёра народных традыцый. Застаецца актуальнай праблема нацыянальнай ідэнтыфікацыі, асэнсавання беларускай гісторыі, стварэння спектакляў, прысвечаных знакавым постацям і гістарычным падзеям. Цікавасць да гістарычных падзей, роднай культуры пацвярджаецца запаўняльнасцю залы на такіх адметных пастаноўках, як «Паўлінка» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (на сцэне тэатра больш за 100 гадоў), «Дзікае паляванне караля Стаха», балет «Вітаўт» Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, «Кар'ера доктара Рауса» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі і інш.

Яскравай падзеяй тэатральнага жыцця стала прэм'ера 11 ліпеня 2021 г. на сцэне НАВТ «Дзікае паляванне караля Стаха» ў пастаноўцы Ганны Маторнай (кампазітар Уладзімір Солтан, дырыжор Андрэй Іваноў) [5]. У дэкарацыях выкарыстаны колеры і матывы слуцкіх паясоў, прынты касцюмаў адсылаюць да беларускіх абразоў XV–XVI стст. У оперы ўдзельнічалі тры трубы (cis, gis, fis) майстра народных музычных інструментаў А. У. Лося. Ігра на ліры перад пачаткам оперы надае глядачам пэўны настрой на пастаноўку, спрыяе пагружэнню ў гістарычную эпоху падзей.

На аснове праведзенага аналізу актуальных тэатральных тэндэнцый назіраецца актыўнае выкарыстанне народных традыцый у пастаноўках драматычных, музычных тэатраў і нават Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, што стала сапраўднай падзеяй у тэатральным жыцці. Дзякуючы выкарыстанню народных музычных інструментаў, касцюмаў, твораў беларускіх пісьменнікаў раскрываецца нацыянальны каларыт, менталітэт і асабістыя рысы беларускага народу, што вельмі важна ва ўмовах сінтэзу культур XXI ст.

*1.* Беларускі тэатр-98 : агляд тэатр. года / пад рэд. Р. Б. Смольскага. – Мінск : Арты-Фэкс, 1999. – 118 с.

*2.* Беларускі тэатр-2000 : агляд тэатр. года / пад рэд. Р. Б. Смольскага. – Мінск : Арты-Фэкс, 2001. – 120 с.

*3.* Беларускі тэатр-2001–2002: агляд тэатр. года / пад рэд. Р. Б. Смольскага. – Мінск : Бел. дзярж. акад. мастацтваў, 2002. – 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Гурченко, А. И.* Фольклорные традиции белорусов в контексте профессиональной подготовки специалистов в Белорусском государственном университете культуры и искусств / А. И. Гурченко // Этническая культура. – 2021. – Т. 3. – № 1. – С. 58–61.

5. Национальный академический Большой театр оперы и балета Республики Беларусь [Электронный ресурс]: офиц. сайт. – Режим доступа: http://www.bolshoibelarus.by. – Дата доступа: 20.08.2021.

6. *Смольскі, Р.* Вынікі тэатральнага сезона 1996/1997 гг. у драматычных тэатрах Беларусі: тэатральны летапіс Беларусі 90-х / Р. Смольскі [і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 1996. – 108 с.

7. *Смольскі, Р.* Вынікі тэатральнага сезона 1995/1996 гг. у драматычных тэатрах Беларусі: тэатральны летапіс Беларусі 90-х / Р. Смольскі [і інш.]. – Мінск : Права і эканоміка, 1996. – 60 с.

8. Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агульн. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : БелЭн, 2002–2003. – 2 т.

УДК 141.2

# ТРАДИЦИОННЫЕ КУЛЬТУРЫ ВОСТОКА И ЗАПАДА: ПРИЧИНЫ И СФЕРЫ ДИФФЕРЕНЦИАЦИИ

***М. А. Можейко,*** *доктор философских наук, профессор кафедры социально-гуманитарных дисциплин учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация**. Объектом исследования выступает дифференциация традиционных культур Запада и Востока. Целью являются экспликации детерминант фундаментальных различий традиционных культур восточного и западного образцов. Статья посвящена решению такой проблемы, как выявление параллелизма различий восточных и западных культур в таких разных сферах, как нравственное сознание, тип философствования, религиозные установки, языковые системы (грамматические конструкции, в частности) и др. Полученный результат представляет собой целостную модель дифференциации традиционных культур Запада и Востока, что позволяет глубже понять как их специфику, так и механизмы взаимовлияния, а также моделировать пути их взаимодействия на современном этапе разворачивания глобализационных процессов (в контексте формирования тенденции глокализации) с учетом автохтонных особенностей тех и других.

**Ключевые слова:** Восток, Запад, традиционная культура, нравственное сознание, тип философствования, религия, язык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ